Весці БДПУ. Серыя 2. 2023. № 2. С. 36–40

*УДК 930.2:003.72(476)«12»*

# ЗАВОЧНАЯ ПЕДАГАГІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШЫЯ ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ

**І. А. Андарала,**
*кандыдат педагагічных навук,*
*дацэнт кафедры менеджменту*
*турызму і гасціннасці БДУФК*

Паступіў у рэдакцыю 27.02.23.

*UDC 930.2:003.72(476)«12»*

# CORRESPONDENCE PEDAGOGICAL EDUCATION IN BELARUS IN THE FIRST POSTWAR YEARS

**I. Andarala,**
*PhD in History, Associate Professor*
*of the Department of Tourism*
*and Hospitality Tourism, BSUPC*

Received on 27.02.23.

У першыя пасляваенныя гады ў Беларусі ва ўмовах інтэнсіўнага росту сеткі школьных устаноў выключна востра паўстала пытанне забеспячэння іх педагагічнымі кадрамі. Каб падрыхтаваць неабходную колькасць настаўнікаў для ўсіх ступеняў агульнаадукацыйнай школы рэспублікі на дзённых аддзяленнях педагагічных, настаўніцкіх інстытутаў і педагагічных вучылішчаў, неабходны былі значныя грашовыя сродкі і матэрыяльныя рэсурсы, а галоўнае – даволі працяглы тэрмін на падрыхтоўку. У складаных сацыяльна-эканамічных умовах было прынята рашэнне аб аднаўленні існаваўшай у даваенныя гады сістэмы завочнай педагагічнай адукацыі, якая ў першую чаргу павінна была ахапіць ужо працуючых у школе настаўнікаў. У артыкуле на аснове вывучэння архіўных крыніц прадстаўлены рэтраспектыўны аналіз і ацэнка працэсу аднаўлення і развіцця завочнай сістэмы падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі педагагічных кадраў рэспублікі ў першыя пасляваенныя гады.

*Ключавыя словы*: завочная педагагічная адукацыя, педагагічныя кадры, педагагічныя інстытуты, настаўніцкія інстытуты, педагагічныя вучылішчы, вучэбна-матэрыяльная база, кантынгент.

In the first postwar years in Belarus in the conditions of intensive growth of school institutions network, the problem of supplying it with pedagogical staff was especially acute. To train the necessary number of teachers for all degrees of comprehensive school of the republic in full-time departments of pedagogical institutes and schools, there was need of significant finances and material resources and most of all quite long time for training. In the complicated social-economic conditions a decision was taken to update the system of correspondence pedagogical education of the prewar time which first of all had to cover the teachers who were already working at schools. Based on studying archive sources, the article presents a retrospective analysis and evaluation of the updating process and development of correspondence system of pedagogical staff training and professional development in the first postwar years.

*Keywords:* correspondence pedagogical education, pedagogical staff, pedagogical institutes, teachers' institutes, pedagogical schools, training facilities, contingent.

*Уводзіны.* На працягу многіх дзесяцігоддзяў у структуры вышэйшай педагагічнай школы Беларусі значнае месца займала завочная падрыхтоўка педагагічных кадраў. За дзевяноста гадоў існавання нацыянальнай завочнай педагагічнай адукацыі адбыліся вялікія змены ў яе колькасных і якасных характарыстыках, змяніліся задачы і функцыі. Сёння завочная падрыхтоўка педагагічных кадраў – гэта не толькі прафесійная адукацыя, але і павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў, якія скончылі педагагічныя каледжы і працуюць у школе. Сучасныя тэндэнцыі ў развіцці грамадства, рэфармаванне адукацыйнай сферы патрабуюць далейшага абнаўлення арганізацыі і зместу завочнай педагагічнай адукацыі. Істотнае значэнне для яе паспяховай мадэрнізацыі мае назапашаны гісторыка-педагагічны вопыт нацыянальнай завочнай педагагічнай школы. Усебаковае навуковае вывучэнне, глыбокі аналіз і тэарэтычнае пераасэнсаванне папярэдніх здабыткаў і пралікаў дазволіць знайсці эфектыўныя шляхі яе ўдасканалення на сучасным этапе развіцця сістэмы адукацыі Беларусі.

Асобныя аспекты развіцця завочнай педагагічнай адукацыі рэспублікі ў савецкі перыяд знайшлі адлюстраванне ў публікацыях беларускіх вучоных Н. Г. Гнеўкі, А. М. Грыгор'евай, М. В. Жарскага, І. М. Ільюшына, В. В. Клімашонка, Г. А. Качан, М. Г. Мінкевіча і інш. Тым не менш, гісторыя яе станаўлення і развіцця застаюцца не да канца даследаванымі і недастаткова асветленымі ў навуковай літаратуры. У прыватнасці, гэта тычыцца аднаўлення завочнай педагагічнай адукацыі ў першыя пасляваенныя гады.

*Асноўная частка.* Сваю гісторыю нацыянальная завочная педагагічная адукацыя пачынае з 21 лютага 1932 г., калі народным камісарам асветы рэспублікі было зацверджана «Палажэнне аб завочных сектарах пры ВНУ, педтэхнікумах, рабфаках сістэмы Наркамасветы» [1, с. 5]. Першыя завочныя сектары пачалі сваю дзейнасць ужо ў 1932/33 вучэбным годзе пры Мінскім вышэйшым педагагічным інстытуце і Магілёўскім педагагічным інстытуце. У наступным 1933/34 вучэбным годзе завочныя сектары былі створаны пры ўсіх педагагічных, настаўніцкіх інстытутах

і 12 педагагічных тэхнікумах. Аднак станаўленне завочнай педагагічнай адукацыі адбывалася вельмі складана і марудна. Гэта было абумоўлена многімі фактарамі. Асноўным стрымліваючым фактарам з'яўлялася адсутнасць матывацыі ў большай часткі працуючых настаўнікаў атрымліваць адукацыю завочна. Тыя ж, хто вучыўся, адносіліся да вучобы фармальна – не з'яўляліся на сесіі і не выконвалі патрабаванняў вучэбнага плана. Так, на завочнае аддзяленне самага буйнога ў рэспубліцы Мінскага вышэйшага педагагічнага інстытута з 1932 па 1937 г. уключна было прынята 2472 чалавекі, а закончыў яго за гэты час з дыпломам настаўніка толькі 141 чалавек. Усе завочныя аддзяленні педагагічных, настаўніцкіх інстытутаў і педагагічных вучылішчаў у 1938 г. выпусцілі ўсяго 196 настаўнікаў пры плане 1387 [2, с. 87].

Атэстацыя, праведзеная ў перыяд з 1936 па 1938 г., у значнай ступені змяніла адносіны настаўнікаў да завочнай адукацыі ў лепшы бок. Настаўнікі, якія не мелі адпаведнай педагагічнай адукацыі і жадання яе атрымаць, па выніках атэстацыі вызваляліся ад работы ў школе. Як следства, у 1938/39 вучэбным годзе колькасць студэнтаў і навучэнцаў на завочных аддзяленнях педагагічных устаноў узрасла да 18 297 чалавек. На працягу 1939 і 1940 г. завочныя аддзяленні педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў закончылі 1479 чалавек, педагагічных вучылішчаў – 1940 чалавек [2, с. 88].

Паступальнае развіццё завочнай педагагічнай адукацыі спыніла Вялікая Айчынная вайна і акупацыя тэрыторыі рэспублікі.

Хуткі рост сеткі агульнаадукацыйных школ, які адбываўся па меры вызвалення тэрыторыі Беларусі ад захопнікаў, выключна абвастрыў праблему педагагічных кадраў. Каб падрыхтаваць неабходную колькасць настаўнікаў на дзённых аддзяленнях педагагічных, настаўніцкіх інстытутаў і педагагічных вучылішчаў, неабходны былі значныя грашовыя сродкі і матэрыяльныя рэсурсы, а галоўнае – даволі працяглы тэрмін на падрыхтоўку. У сувязі з гэтым у чэрвені 1944 г. Нарком асветы Е. І. Уралава звярнулася да Старшыні СНК БССР П. К. Панамарэнкі з просьбай аб аднаўленні дзейнасці завочных аддзяленняў пры ўсіх тыпах вучэбных педагагічных устаноў рэспублікі [3, л. 107]. 9 кастрычніка 1944 г. СНК БССР прыняў пастанову за № 655 «Аб аднаўленні сеткі завочнай педагагічнай адукацыі» [3, л. 246]. У адпаведнасці з гэтай пастановай пры ўсіх педагагічных, настаўніцкіх інстытутах і педагагічных вучылішчах рэспублікі з 1944/45 вучэбнага года аднаўлялася дзейнасць завочных аддзяленняў. Прыняты дакумент абавязваў усіх настаўнікаў, якія не мелі педагагічнай адукацыі, закончыць адпаведныя завочныя педагагічныя вучэбныя ўстановы ў наступныя тэрміны:

- настаўнікі 1–4 класаў – педагагічныя вучылішчы да 1 жніўня 1947 г.;
- настаўнікі 5–7 класаў – настаўніцкія інстытуты да 1 жніўня 1946 г.;
- настаўнікі 8–10 класаў – педагагічныя інстытуты або ўніверсітэты да 1 жніўня 1948 г.

Для настаўнікаў, якія атрымлівалі адукацыю завочна, прадугледжваўся шэраг істотных льгот. У прыватнасці, настаўнікам-завочнікам кампенсаваліся затраты за праезд на сесію і назад; тыя з іх, хто паспяхова вучыўся, вызваляліся ад аплаты за навучанне [3, л. 246].

З мэтай рэалізацыі вышэйназванай пастановы СНК БССР народны камісар асветы рэспублікі выдаў загад № 161 ад 18 лістапада 1944 г. [4, л. 203], згодна з якім загадчыкам аддзелаў народнай адукацыі належала не пазней за 15 лістапада 1944 г. праверыць склад настаўнікаў, абавязаных атрымаць адпаведную адукацыю і не залічаных да гэтага тэрміну на завочныя аддзяленні. Загад наркама асветы патрабаваў «…настаўнікаў, якія ўхіляліся ад завочнага навучання і не выконвалі вучэбных заданняў пэўнай вучэбнай установы без уважлівых прычын, вызваляць ад работы ў школе або пераводзіць на работу ў ніжэйшыя класы» [4, л. 204–205].

Прынятая ў 1944 г. пастанова СНК БССР «Аб аднаўленні сеткі завочнай педагагічнай адукацыі» і зацверджаная ў адпаведнасці з ёй сетка і кантынгент завочных аддзяленняў пры педагагічных, настаўніцкіх інстытутах і педагагічных вучылішчах на 1944/45 вучэбны год [4, л. 203] садзейнічалі таму, што ўжо ў 1944/45 вучэбным годзе завочныя аддзяленні пачалі функцыянаваць пры 5 педагагічных, 8 настаўніцкіх інстытутах і 22 педагагічных вучылішчах. План прыёму на завочныя аддзяленні пры педагагічных і настаўніцкіх інстытутах склаў адпаведна 1650 і 1650 чалавек, пры педагагічных вучылішчах – 5930 чалавек [5, л. 269].

Аднак, нягледзячы на значную растлумачальную і агітацыйную работу з боку абласных, раённых аддзелаў народнай адукацыі, кіраўнікоў школ, мерапрыемствы педагагічных навучальных устаноў (інфармаванне праз перыядычны друк аб узнаўленні дзейнасці завочных аддзяленняў і правілы прыёму, выезды выкладчыкаў у раёны для правядзення сустрэч з настаўнікамі, якія не мелі педагагічнай адукацыі), план прыёму на завочную падрыхтоўку настаўніцкіх кадраў выканаць поўнасцю не ўдалося. У педагагічныя і настаўніцкія інстытуты было залічана 3274 студэнты з запланаваных 3300. На зімовую сесію з'явілася толькі 2227 чалавек [5, л. 46)]. На завочныя аддзяленні педагагічных вучылішчаў атрымалася залічыць 4590 навучэнцаў пры плане 5930 [6, л. 224].

Адмоўна сказалася на якасці падрыхтоўкі настаўнікаў-завочнікаў у першы вучэбны год і арганізацыя вучэбных працэсаў у педагагічных навучальных установах. Аснашчэнне кабінетаў і лабараторый было выключна бедным. Падручнікі па спецыяльных дысцыплінах адсутнічалі наогул або былі ў адзінкавых экземплярах. Тыповымі для першай установачнай сесіі былі і зрывы заняткаў па прычыне адсутнасці выкладчыкаў.

Вынікі першай сесіі студэнтаў-завочнікаў выклікалі вялікую занепакоенасць у Наркамасветы

рэспублікі. Стан завочнага навучання ў інстытутах стаў прадметам абмеркавання на нарадзе, праведзенай ім з дырэктарамі педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў, прарэктарамі па завочным навучанні, якая адбылася 27 сакавіка 1945 г. [5, л. 45]. Па выніках гэтай нарады 25 красавіка 1945 г. быў выдадзены загад «Аб стане завочнага навучання пры вышэйшых педагагічных навучальных установах БССР». У загадзе адзначалася, што кіраўніцтва інстытутаў, абласных і раённых аддзелаў народнай адукацыі не забяспечылі поўную яўку настаўнікаў-завочнікаў на зімовую сесію; інстытуты правялі недастатковую работу па падрыхтоўцы да зімовай сесіі, у выніку чаго асобныя курсы, прадугледжаныя вучэбнымі планамі, не былі прачытаны па прычыне адсутнасці выкладчыкаў; студэнты-завочнікі не былі поўнасцю забяспечаны жылой і вучэбнай плошчай; асобныя інстытуты скарацілі працягласць зімовай сесіі, што прывяло да невыканання вучэбных планаў і інш. [5, л. 46].

З мэтай ліквідацыі існуючых недахопаў загадчыкам абласных аддзелаў народнай адукацыі было даручана, у прыватнасці, устанавіць дакладны ўлік настаўнікаў, працуючых у 5–10 класах і не маючых неабходнай педагагічнай адукацыі, з тым, каб у 1945/46 вучэбным годзе поўнасцю ахапіць іх завочным навучаннем у педагагічных і настаўніцкіх інстытутах; дырэктарам інстытутаў з мэтай кансультавання арганізаваць выезды кваліфікаваных выкладчыкаў у раёны, дзе маецца вялікая колькасць настаўнікаў-завочнікаў; своечасова рыхтавацца і арганізавана праводзіць сесіі завочнікаў і інш.

Загад абавязваў упраўленне вышэйшай школай Наркамасветы і дырэктараў інстытутаў забяспечыць усіх настаўнікаў-завочнікаў вучэбнымі праграмамі па курсах вучэбных планаў, павысіць кантроль за работай завочных аддзяленняў і іх падрыхтоўкай да правядзення летняй сесіі [5, л. 46].

Для таго каб арганізавана правесці летнюю экзаменацыйную сесію студэнтаў-завочнікаў і ўступную кампанію 1945/46 вучэбнага года, Наркамасветы 5 мая 1945 г. выдаў загад № 97, у якім устанавіў канкрэтныя тэрміны правядзення летняй сесіі, уступных экзаменаў для абітурыентаў, паступаючых на завочныя аддзяленні [5, л. 52].

Да пачатку 1945/46 вучэбнага года школьная адукацыя рэспублікі некалькі палепшыла якасны склад педагагічных кадраў за кошт настаўнікаў, дэмабілізаваных з Савецкай Арміі і вярнуўшыхся з эвакуацыі. Усяго на 1 верасня 1945 г. у школах Беларусі працавала 45 332 настаўнікі [7]. Аднак становішча з камплектаваннем школ кваліфікаванымі настаўнікамі заставалася выключна складаным. Асабліва гэта адчувалася ў заходніх абласцях рэспублікі. Адзіным выхадам у такім становішчы было ўключэнне ў сістэму завочнага педагагічнага навучання ўсіх настаўнікаў, якія не мелі адпаведнай педагагічнай адукацыі. У сувязі з гэтым на пачатак 1945/46 вучэбнага года завочнае навучанне было арганізавана пры ўсіх педагагічных, настаўніцкіх інстытутах і педагагічных вучылішчах. Аднак, як адзначалася ў загадзе Наркамасветы рэспублікі № 214 ад 28 лістапада 1945 г. «Аб мерапрыемствах па ўмацаванні завочнага навучання ў рэспубліцы» [5, л. 174], пастанова СНК БССР ад 9 кастрычніка 1944 г. «Аб аднаўленні сеткі завочнай педагагічнай адукацыі» [3, л. 246] і загад Наркамасветы ад 25 красавіка 1944 г. «Аб стане завочнага навучання пры вышэйшых педагагічных вучэбных установах» [5, л. 46] аказаліся «ў значнай ступені не выкананымі» [5, л. 174]. У прыватнасці, удзел у летняй сесіі прыняло толькі 65 % ад агульнай колькасці настаўнікаў-завочнікаў. Нізкім на пачатак 1945/46 вучэбнага года быў і працэнт ахопу завочным навучаннем настаўнікаў, якія не мелі педагагічнай адукацыі. Так, навучаннем у педагагічных і настаўніцкіх інстытутах было ахоплена 3758 чалавек з 5403 улічаных настаўнікаў, якія не мелі педагагічнай адукацыі, у педагагічных вучылішчах – 4590 чалавек з 10 416 [5, л. 174]. Каб выканаць план прыёму на завочныя аддзяленні педагагічных вучылішчаў Наркамасветы вымушаны быў прадоўжыць прыём заяў да 1 студзеня 1945 г. [5, л. 178].

Загад патрабаваў ад загадчыкаў раённых і абласных аддзелаў адукацыі скласці да 1 снежня 1945 г. персанальныя спісы настаўнікаў, падлягаючых завочнаму навучанню, з указаннем тэрмінаў заканчэння вучэбнай установы кожным настаўнікам. Ставілася задача ахапіць завочным навучаннем усіх настаўнікаў, якія не мелі спецыяльнай адукацыі і забяспечыць яўку залічаных і студэнтаў-завочнікаў старшых курсаў на зімовую сесію. У адпаведнасці з загадам кожны студэнт-завочнік быў абавязаны зрабіць справаздачу аб выкананні вучэбнага плана папярэдняга вучэбнага года і першага семестра бягучага года.

Дырэктарам інстытутаў і педагагічных вучылішчаў было загадана арганізаваць сетку кансультацыйных пунктаў, забяспечыць на іх чытанне лекцый і кансультацый для настаўнікаў-завочнікаў не радзей чым два разы на месяц.

Загадчыкі аддзелаў народнай адукацыі абавязаны былі персанальна, не радзей чым адзін раз на квартал правяраць выкананне кожным завочнікам вучэбных заданняў. Прадпісвалася: настаўнікаў, якія не мелі вышэйшай адукацыі і ўхіляліся ад завочнай вучобы ў педагагічных і настаўніцкіх інстытутах, пераводзіць для працы ў пачатковыя класы.

Загад абавязваў загадчыкаў аддзелаў адукацыі, дырэктараў школ стварыць настаўнікам-завочнікам усе ўмовы для паспяховага выканання імі вучэбных заданняў, прадаставіць ім чатыры вольныя вечары на тыдзень, забяспечыць газай [5, л. 174].

Прыняты 18 сакавіка 1946 г. «Закон аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1946–1950 гг.» вызначыў перспектывы развіцця асветы краіны ў другой палове 1940-х гг. [8, с. 75–77]. Яны прадугледжвалі завяршэнне пераходу да ўсеагульнай абавязковай пачатковай адукацыі, пачатак пераходу да ўсеагульнай абавязковай сямігадовай адукацыі,

забеспячэнне ўсеагульнай абавязковай адукацыі дзяцей з сямігадовага ўзросту.

Выкананне Беларуссю задач, вызначаных планам у галіне школьнай адукацыі, абумовіла істотны рост колькасці пачатковых і асабліва сямігадовых і сярэдніх школ, кантынгенту навучэнцаў у іх. Адкрыццё новых школ і класакамплектаў яшчэ больш абвастрыла і да таго існаваўшую праблему няхваткі кваліфікаваных настаўнікаў, асабліва настаўнікаў з вышэйшай адукацыяй. Падрыхтаваць неабходную колькасць дыпламаваных педагогаў з вышэйшай адукацыяй у кароткія тэрміны на стацыянарных аддзяленнях педагагічных навучальных устаноў было немагчыма. У гэтых умовах завочная падрыхтоўка настаўнікаў набывала важнае дзяржаўнае значэнне.

Каб умацаваць арганізацыйныя асновы сістэмы завочнай адукацыі, Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР 20 красавіка 1946 г. зацвердзіла «Палажэнне аб завочным аддзяленні пры педагагічным (настаўніцкім) інстытуце» [8, с. 14].

Палажэннем былі вызначаны агульныя задачы завочных аддзяленняў пры педагагічных (настаўніцкіх) інстытутах, правы і абавязкі студэнтаў-завочнікаў, арганізацыйна-педагагічныя асновы вучэбнага працэсу ў сістэме завочнай адукацыі, структура кіравання завочнай адукацыяй.

Кіруючыся «Палажэннем аб завочным аддзяленні пры педагагічным (настаўніцкім) інстытуце», Міністэрства асветы БССР зацвердзіла штатны расклад завочных аддзяленняў педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў рэспублікі на 1946/47 вучэбны год. Ён прадугледжваў істотнае павелічэнне колькасці штатных адзінак і ўвядзенне новых пасад: дэкана факультэта, бібліятэкара, загадчыка кансультацыйным пунктам. Агульная колькасць штатных адзінак на завочных аддзяленнях інстытутаў павялічылася з 22 у 1945/46 вучэбным годзе да 56 у 1946/47 вучэбным годзе.

У гэтым жа годзе ўпершыню на дзяржаўным узроўні была зроблена спроба рэалізацыі ідэі бесперапыннай педагагічнай адукацыі. Гэтаму садзейнічаў загад Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР № 554 ад 11 кастрычніка 1946 г. «Аб прыёме на завочныя аддзяленні педагагічных інстытутаў асоб, якія закончылі настаўніцкія інстытуты» [9, л. 336]. Дадзены загад быў прадубліраваны і міністэрствам асветы БССР № 116 ад 26 кастрычніка 1946 г. [9, л. 342]. У адпаведнасці з загадам выпускнікі настаўніцкіх інстытутаў атрымалі права без уступных экзаменаў паступаць на старшыя курсы адпаведных факультэтаў педагагічных інстытутаў. Такім чынам, на завочныя аддзяленні педагагічных інстытутаў, акрамя функцыі падрыхтоўкі педагагічных кадраў, была ўключана функцыя павышэння кваліфікацыі настаўнікаў, што мелі адукацыю ў аб'ёме настаўніцкага інстытута.

План прыёму на завочныя аддзяленні педагагічных навучальных устаноў рэспублікі на 1946/47 вучэбны год быў значна павялічаны. Так, на першы курс педагагічных інстытутаў планавалася залічыць 800, настаўніцкіх інстытутаў – 1400 чалавек. Аднак, як паказала практыка, нягледзячы на намаганні інстытутаў і вучылішчаў, абласных і раённых аддзелаў адукацыі, план прыёму на завочныя аддзяленні, як і ў папярэднія гады, аказаўся істотна недавыкананым. Пры агульным плане прыёму 5025 чалавек на першыя курсы завочных аддзяленняў было залічана толькі 2739, або 54,5 % ад плана, у тым ліку ў педагагічныя вучылішчы 45 % [10, л. 249].

Акрамя невыканання плану прыёму, у тым жа 1946/47 вучэбным годзе прадоўжылася практыка адсеву значнай колькасці студэнтаў-завочнікаў. Асноўнай прычынай, як і ў папярэдні год, была няяўка на сесіі. З 4373 студэнтаў завочных аддзяленняў педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў на працягу вучэбнага года быў адлічаны 871 чалавек, або 19 % [10, л. 251].

Як сведчаць архіўныя матэрыялы, план прыёму студэнтаў-завочнікаў у педагагічныя навучальныя ўстановы рэспублікі на наступны 1947/48 вучэбны год у параўнанні з папярэднім аказаўся значна заніжаным. Гэта можна тлумачыць толькі жаданнем Міністэрства асветы любым спосабам дабіцца выканання планавых заданняў па прыёме на завочныя аддзяленні.

Такая палітыка ў адносінах да завочнай падрыхтоўкі педагагічных кадраў не толькі не садзейнічала ліквідацыі дэфіцыта ў настаўніках, а, наадварот, павялічвала яго. Па даных праверкі, праведзенай Міністэрствам народнага кантролю БССР, на пачатак 1947/48 вучэбнага года ў школах Беларусі меўся недакамплект 8116 настаўнікаў [10, л. 249].

*Заключэнне.* У першыя пасляваенныя гады падрыхтоўка настаўніцкіх кадраў і павышэнне іх прафесійнай кваліфікацыі з'яўляліся найважнейшай умовай паспяховага аднаўлення школьнай адукацыі Беларусі. Істотны ўклад, на думку кіраўніцтва рэспублікі, у ліквідацыю вострага дэфіцыту педагагічных кадраў для агульнаадукацыйных школ павінна была ўнесці завочная падрыхтоўка настаўнікаў. Менавіта таму было прынята некалькі партыйна-ўрадавых пастаноў, рэалізацыя якіх дазволіла ў сціслыя тэрміны не толькі аднавіць дзейнасць даваенных завочных аддзяленняў педагагічных, настаўніцкіх інстытутаў і педагагічных вучылішчаў, але і стварыць новыя. Аднак, як сведчаць архіўныя крыніцы, арганізацыйная і агітацыйная работа, праведзеная сярод настаўнікаў, якія не мелі адпаведнай педагагічнай адукацыі, не дала станоўчых вынікаў. Планы прыёму на завочныя аддзяленні педагагічных навучальных устаноў пастаянна не выконваліся. Настаўнікі-завочнікі, нягледзячы на шэраг істотных для іх ільгот, вельмі пасіўна адносіліся да вучобы. Гэта праяўлялася ў нездавальняючай яўцы на сесіі і нізкай вучэбнай паспяховасці. Такі стан завочнай падрыхтоўкі настаўнікаў фактычна не аказваў істотнага ўплыву на вырашэнне праблемы падрыхтоўкі педагагічных кадраў для школьнай адукацыі рэспублікі.

### Літаратура і крыніцы

1. Зборнік матэрыялаў па педагагічным завочным навучанні ў БССР. – Мінск : Вучпедсектар ДВБ. Друк. імя Сталіна, 1932. – 28 с.
2. *Дрозд, Л. Н.* Развитие средней общеобразовательной школы в Белоруссии 1917–1941 / науч. ред. А. А. Гримоть. – Минск : Нар. асвета, 1986. – 160 с.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 42. Воп. 4. Спр. 266.
4. НАРБ. – Ф. 4. Воп. 17. Спр. 32.
5. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 4. Спр. 262.
6. НАРБ. – Ф. 4. Воп. 17. Спр. 21.
7. *Ільюшын, І. М.* Народная адукацыя ў Беларускай ССР / І. М. Ільюшын, С. А. Умрэйка. – Мінск : Вуч.-пед. выд-ва МА БССР, 1957. – 357 с.
8. Директивы ВКП(б) и постановления Советского правительства о народном образовании: Сб. док. За 1917–1947 гг. // Советская педагогика: Прил. – Вып. 1; сост. Н. И. Болдырев. – М.; Л. : Изд-во АПН РСФСР, 1947. – 320 с.
9. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 4. Спр. 259.
10. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 4. Спр. 298.

### References

1. Zbornik materyyalaŭ pa pedagagichnym zavochnym navuchanni ŭ BSSR. – Minsk : Vuchpedsektar DVB. Druk. imya Stalina, 1932. – 28 s.
2. Drozd, L. N. Razvitie srednej obshcheobrazovatel'noj shkoly v Belorussii 1917–1941 / nauch. red. A. A. Grimot'. – Minsk : Nar. asveta, 1986. – 160 s.
3. Nacyyanal'ny arhiŭ Respubliki Belarus' (NARB). – F. 42. Vop. 4. Spr. 266.
4. NARB. – F. 4. Vop. 17. Spr. 32.
5. NARB. – F. 42. Vop. 4. Spr. 262.
6. NARB. – F. 4. Vop. 17. Spr. 21.
7. Il'yushyn, I. M. Narodnaya adukacyya ŭ Belaruskaj SSR / I. M. Il'yushyn, S. A. Umrejka. – Minsk : Vuch.-ped. vyd-va MA BSSR, 1957. – 357 s.
8. Direktivy VKP(b) i postanovleniya Sovetskogo pravitel'stva o narodnom obrazovanii: Sb. dok. Za 1917–1947 gg. // Sovetskaya pedagogika: Pril. – Vyp. 1; sost. N. I. Boldyrev. – M.; L. : Izd-vo APN RSFSR, 1947. – 320 s.
9. NARB. – F. 42. Vop. 4. Spr. 259.
10. NARB. – F. 42. Vop. 4. Spr. 298.